# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

17 траўня 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Андрэй Атаманчук, Алена Філатава, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька, Дзмітрый Лазавік.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сяброў Выбарчай камісіі прысутнічае – 5 чалавек. Кворум выкананы.

Пасяджэнне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

На пасяджэнні Выбарчай камісіі прысутнічаюць сябры Выбарчай камісіі з правам голасу, а таксама сябры сакратарыята Выбарчай камісіі, якія з'яўляюцца непублічнымі асобамі, аказваюць тэхнічную дапамогу Выбарчай камісіі, у тым ліку складаюць пратакол пасяджэння Выбарчай камісіі, аднак правам галасы не валодаюць.

**Парадак дня**:
1. Якія змены адбыліся ў спісах кандыдатаў
2. Падрыхтоўка да дзён галасавання.

**Разгляд пытання №1.**
Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 17 траўня 2024 года.
Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.
Па пытанні № 1 прагаласавалі:
"За" - 5 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.

ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 17 траўня 2024 года.

**Разгляд пытання №2.**

## 1. Змены ў спісах кандыдатаў

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні змен ў спісах кандыдатаў.

“За апошні тыдзень у спісах ніякіх зменаў не адбылось. Як па мне - гэта з’яўляецца добрай навінай, то бок у нас не было ніякіх запытаў на выдаленне, ніякіх падставаў для выдалення чальцоў спісаў. І таму на сённяшні момант спісы выглядаюць наступным чынам:

- Закон і правапарадак у складзе - 20 чалавек
- Независимые белорусы - 14 чалавек
- Общественное Движение "Страна Для Жизни” - 17 чалавек
- Аб'яднанне "Наша справа" - 13 чалавек
- Каманда Латушкі і Рух "За Свабоду" - 45 чалавек
- Голас дыяспар — Адзінства па-над межамі - 13 чалавек
- Блок Пракоп'ева-Ягорава - 34 чалавек
- Моладзевы наступ - 15 чалавек
- Хватит бояться - 14 чалавек
- Еўрапейскі выбар - 35 чалавек
- Воля -18 чалавек
- Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя "Салідарнасць" - 19 чалавек

Агулам у нашай кампаніі ўдзельнічаюць **257 кандыдатаў.**

Спадзяюся, что ніякі ціск, які аказваецца на людзей, не спрычыніцца да таго, каб людзі выдаляліся. Нагадаю ўсім, што ўчора стала вядома - ***усе спісы, якія ўдзельнічаюць у выбарах у Каардынацыйную Раду, прызнаны экстрэмістскімі фармаваннямі.***

## 2. Удзел ў выбарчым працэсе

“За апошні тыдзень да нас паступалі запыты ад саміх выбаршчыкаў наконт магчымага ўдзелу ў выбарчым працэсе. Пытанні тычацца тых беларусаў, якія не маюць беларускіх пашпартоў. У нас няма тэхнічных магчымасцяў верыфікаваць дакументы, ID, пашпарты іншых краінаў, таму што пад кожны такі дакумент павінны ствараццa асобныя пратаколы і асобныя верыфікацыі.
У нас ёсць тэхнічныя магчымасці на 100% верыфікаваць толькі пашпарты грамадзян Беларусі”.

***Яраслаў Бекіш***: “У выбарах могуць удзельнічаць грамадзяне Руспублікі Беларусь з пашпартамі нават калі гэтыя пашпарты пратэрмінованы”.

***Алена Прыходзька***: “Я хочу звярнуцца да вас, паважаныя беларусы: калі мы хочам правесці максімальна шчырыя і максімальна правільныя выбары што тычыцца стандартаў верыфікацыі, мы павінны выбіраць паміж гэтымі самымі стандартамі і тымі жыццевымі абставінамі, у якіх мы ўсе апынуліся. На жаль, на сённяшні момант, кампанія, якая з’яўляецца верыфікатарам дакументаў, дае сертыфікаты якасці і не дае выключэнняў. Гэта ўсё робіцца аўтаматычна”.

***Алена Філатава***: “Калі мы разглядалі розныя верыфікацыйныя сістэмы, ва главу пытання мы ставілі пытанне бяспекі. Мы прапрацавалі розныя мадэлі і варыянты, самастойна тэсціравалі, праходзілі ўсе этапы, каб пераканацца ў тым, што сістэма з’яўляецца бяспечнай і дзейсна працоўным варыянтам. Мы выпрацавалі максімальна бяспечную і

працоўную мадэль у тых умовах, у якіх сёння знаходзяцца беларусы. Тыя, хто змогуць далучыцца да працэсу галасавання, мы заклікаем гэта зрабіць, таму што ёсць пэўныя абмежаванні і ўсё залежыць ад тых, у каго ёсць магчымасць гэта зрабіць".

***Алена Прыходзька***: "Дадам яшчэ: учора мы праводзілі тэст адносна таго, ці прачытае сістэма вельмі якасны скан пашпарта, і сістэма яго адразу адмовіла. Рэліз платформы будзе дададзены ў Apple Store і Play Market 20 траўня, да гэтага часу, калі ласка, вывучыце інструкцыі і як правільна выдаліць прыладу са свайго тэлефона. Прыладу можна будзе спамаваць без VPN. Калі беларускі рэжым увядзе баны і блокі на гэта, то тады ўжо будзе трэба рабіць гэта с VPN. Увесь працэс займае не больш 15-20 хвілін. Калі вы знаходзіціся ў Беларусі, вы можаце спамаваць дадатак непасрэдна ў дзень выбараў 25 траўня, каб не падвяргаць сябе дадатковай небяспецы. Усе астатнія беларусы могуць пачаць спамаваць дадатак 20 чысла".

## 3. Стварэнне стацыянарных пунктаў

***Алена Прыходзька:* "**Выбарчая камісія арганізоўвае стацыянарныя пункты ў Вільні і ў Варшаве. Пакуль мы не называем адрасы пунктаў, і яны не будуць выкладацца ў публічную прастору. Гэтыя пункты для таго, каб акрэдытаваныя прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі альбо назіральнікі ад грамадскіх супольнасцяў, палітычных партый, ад выбарчых суб'ектаў, усе, хто хоча спрычыніцца да назірання - вы можаце ўжо сёння накіроўваць на нашу афіцыйную пошту свае запыты на акрэдэтацыю. У дні галасавання, з 25-га па 27 траўня, вы можаце наведаць гэтыя пункты фізічна, ажыццявіць назіранне, задаць пытанні, сустрэцца з прадстаўнікамі выбарчых суб'ектаў, прадстаўнікамі выбарчай камісіі, міжнароднымі назіральнікамі. Усё гэта мы зможам вам прадаставіць па папярэднім запыце і папярэдняй акрэдытацыі.

На афіцыйнам сайце Каардынацыйнай Рады будуць выкладзены інструкцыі, як гэта зрабіць: напісаць на пошту і запоўніць форму.
У нас ўжо есць замежныя назіральнікі, з якімі мы ўжо пачалі супрацу, мы ўзгаднілі з імі дарожную мапу нашай супрацы, і сення мы таксама дашлем дадаткова запрашэнні да прадстаўнікоў польскага і літоўскага парламентаў, калі яны палічаць магчымым даслаць сваіх назіральнікаў. Таксама ў нас ужо ёсць запыты ад міжнародных сродкаў масавай інфармацый на акрэдэтацыю. Мы спадзяемся, што беларускія незалежныя СМІ таксама праявяць увагу і цікавасць да працэсу".

## 4. Бюджэт нашай камісіі

***Яраслаў Бекіш***: "Узнікаюць пытанні, як фармуецца бюджэт нашай камісіі, як мы арганізоўваем мерапрыемствы і г.д. Мы можам прадаманстраваць свой бюджэт: каб гэта зрабіць, вам патрэбна ўявіць круглы НУЛЬ. У нас намя ніякага бюджэту ўвогуле, але, магчыма, у нас будзе маленькая магчымасць выдзяліць данат ці мікрагрант, каб перакрыць некаторы кошт, звязаны са стацыянарнымі пунктамі назірання. Гэта будзе альбо безкаштоўна прадастаўлена, альбо за вельмі сімвалічную плату. Іншага бюджэту ў нас няма. Усе чальцы камісіі працуюць безштоўна як валанцеры".

## 5. Паводзіны падчас агітацыі. Як сябе паводзіць у дзень выбараў.

***Алена Прыходзька:* "**Дзень ціщыні мы не планавалі і не збіраемся ўводзіць ніякіх абмежаванняў на агітацыю падчас самаго выбарчага перыяду з 25 па 27 траўня. Выбарчыя суб'екты могуць працягваць агітаваць, рэкламаваць сябе, але каб ўся гэтая агітацыя вялася ў межах

здаровага глузду, павагі адзін да аднаго, без выкарыстання чорнага піару, маніпуляцый. Каб гэта быў здаровы самапіар і самарэклама, а не спробы забрудзіць сваіх апанентаў і за кошт гэтага палепшыць свае рэйтынгі".

***Алена Філатава:*** "Заўвага да сроўдкаў СМІ: я б папрасіла бы СМІ да 27-га траўня не ўплываць на меркаванні людзей, не падаваць ціску, не займацца дыскрыдытацыяй. Гэта першыя выбары з мэтай палепшыць беларускае меркаванне наконт выбараў. Выбарчая камісіі са свайго боку зрабіла ўсё ад сабе залежнае, каб гэтыя выбары адбыліся. Прашу СМІ с поўнай ўважлівасцю і з поўнай адказнасцю падыйсці да выбарчага працэсу і з павагай да выбарчай камісіі. Дзякуй!"

***Алена Прыходзька:*** "У выбарчай камісіі будзе магчымасць у рэжыме рэальнага часу назіраць за тым, як складаюцца галасы, на чым баку перавага, але мы наўмысна адмовіліся гэту інфармацыю публічыць для таго, каб не было ніякага ўплыву на канчатковае рашэнне выбаршчыкаў.

Такія сведкі будуць таксама ў назіральнікаў, калі яны падпішуць адпаведны дакумент. Афіцыйна вынікі мы абвесцім непасрэдна па месцы. Падчас таго, як выбары скончацца, за гадзіну да гэтага, мы зробім экзітпол. Усе астатнія "злівы", сведкі, інфармацыіі г.д. аб рэйтынгах лічацца дэзінфармацыяй.

Адсочвайце інфармацыю адносна выбараў, задавайце пытанні, мы адказваем на ўсе пытанні, чытайце інфармацыю пра выбары ў адпаведных крыніцах, якія з'яўляюцца сапраўднымі журналістамі. На Зеркале выйшла інтэрв'ю с Паўлам Ліберам наконт пытанняў аб дадатку.

Спадзяемся на вашу свядомасць і нагадаю, што мы адкрыты да супрацы. Сенняшняе пасяджэнне аб'яўляю закрытым. Жыве Беларусь!"

## Пасяджэнне абвешчана закрытым.